ЁСЦЬ ТАКІ ВОПЫТ

# ПАВЕРЫЦЬ У СЯБЕ

## дапамагаюць маладым людзям у Міханавічах

**Крыху больш за год таму ў вёсцы Міханавічы, што пад Мінскам, стартаваў сумесны праект (менавіта так гэта называецца) прыхода свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага і тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінскага раёна па стварэнні пункта дзённага знаходжання для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Сёння яго наведваюць 24 чалавекі ва ўзросце ад 18 гадоў. За гэты адносна кароткі час даказана, што такія ўстановы сябе апраўдваюць. Адкрыццё гэтага пункта — прыклад супрацоўніцтва царквы і дзяржавы ў сацыяльнай сферы. Гэта адзін з першых падобных праектаў у Мінскай вобласці. Прыход выдзеліў для работы памяшканні, а дзяржава стварыла рабочыя месцы, аплачвае працу сацыяльных работнікаў і інструктараў.**

Хто б думаў, што Дзмітрый Шыцікаў — інвалід першай групы, з дыягназам дзіцячы цэрэбральны параліч і затрымкай у развіцці — пачне здзіўляць навакольных сваімі малюнкамі?

— Хлопец пачынаў з таго, што вучыўся праводзіць лінію ручкай. Але ў яго нічога не атрымлівалася. І тады выкладчыца Ірына Міхайлаўна прапанавала яму ўзяць у рукі мел. Ён трэніраваўся некалькі месяцаў. І праз паўгода адбыўся цуд: раптам пачаў маляваць карціны, — расказаў **настаяцель прыхода Дзімітрый ГРЫЦЭНКА.** — І калі ў яго цікавімся, як гэта ў цябе атрымліваецца, адказвае: «Я не ведаю». Можна сказаць, што гэта Божы цуд, міласць да хлопца, яго сям'і, кіраўніка гуртка і да нас усіх. Спецыялісты сцвярджаюць, што гэтыя работы маюць мастацкую каштоўнасць.

У кабінеце фізічнай рэабілітацыі для наведвальнікаў усталяваны трэнажоры, дзе яны адналяюць дробныя функцыі і маторыку. Для кожнага складаецца адпаведная праграма, праводзіцца індывідуальныя заняткі. У гуртку дамаводства вучаць гатаваць розныя стравы, сервіраваць стол, правільна расстаўляць талеркі і раскладваць відэльцы і лыжкі. Хлопцы і дзяўчаты ахвотна наведваюць гуртох фатаграфіі. Для аматараў фотасправы спонсары выдзелілі неабходную апаратуру.

> Гэты цэнтр — паказчык, як трэба працаваць з дзецьмі. А мы яшчэ робім ухіл на тое, каб гэтыя дзеці займаліся спортам.

Словам, за кароткі тэрмін удалося прымусіць маладых людзей паверыць у свае сілы, у тое, што яны такія ж самыя, як і ўсе астатнія.

— Мы сябе пазіцыянуем як прадаўжальнікі справы і вучні айца Ігара Карасцялёва, які ўжо некалькі дзясяткаў гадоў служыць у Мінску, у прыходзе Усіх Смуткуючых Радасць. Менавіта ён стварыў сацыяльныя майстэрні для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Мы ўзялі гэтую ідэю, каб вучні-інваліды змаглі сацыялізавацца ў грамадства, вызвалілі сваіх бацькоў, каб навучыліся абслугоўваць самі сябе і атрымалі магчымасць працаваць. Канешне, такі працэнт людзей невялікі, але яны прынясуць карысць грамадству — не толькі духоўную, але і матэрыяльную, — упэўнены айцец Дзімітрый.

А цяпер тут плануецца пабудаваць яшчэ і шматфункцыянальны цэнтр для падрыхтоўкі спартсменаў-параалімпійцаў.

— Дзеці павінны разумець, што за імі стаіць грамадства, што можна дабівацца перамог, як нашы спартсмены-параалімпійцы Андрэй Праневіч ці Ігар Бокій, заваёўваць медалі на спаборніцтвах самага высокага ўзроўню, — канстатуе **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па параалімпійскіх відах спорту Аляксандр ФЛЁРКА.** — Наша галоўная задача ў тым, каб прыцягнуць і падрыхтаваць рэзерв для нацыянальнай камады, каб спартсмены прадстаўлялі Беларусь на міжнароднай арэне, каб дзеці-інваліды палюбілі спорт і ахвотна ім займаліся.

— Спорт — адна з форм рэабілітацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі, — лічыць **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Мікалай УЛАХОВІЧ.** — Тут павінен з'явіцца цэлы комплекс: з басейнам, адкрытымі пляцоўкамі для заняткаў тэнісам і гульнявымі відамі спорту. Гэты цэнтр — прыклад таго, як трэба працаваць з дзецьмі. А яшчэ хочам, каб гэтыя дзеці займаліся спортам. Мы звяртаем увагу не проста на інвалідаў, а на інвалідаў-спартсменаў. А наогул рух — гэта жыццё, спорт для такіх людзей павінен быць бясплатным.

Адным са спонсараў, мяркуецца, будзе адкрытае акцыянернае таварыства «Газпрам трансгаз Беларусь». Намеснік генеральнага дырэктара таварыства Юрый Ляшэнка выказаў упэўненасць, што царква і нядзельная школа, якую таксама дапамаглі пабудаваць газавікі, сталі важнымі часткамі духоўнага жыцця аграгарадка Міханавічы.

— Гэтая ідэя нарадзілася некалькі гадоў таму, — дадаў Мікалай Улаховіч. — Менавіта Міханавічы лічацца пасёлкам газавікоў. Разам са старшынёй сельскага Савета дэпутатаў Святланай Давальцовай мы вырашылі звярнуцца да грамадскасці, айца Дзімітрыя, да раённай улады. У малых населеных пунктах, як сказаў кіраўнік дзяржавы, трэба будаваць інфраструктуру, спартыўныя комплексы. Што мы і робім.

Спецыялісты камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама актыўна супрацоўнічаюць з многімі манастырамі, але такога глабальнага праекта яшчэ не было. Ён дасць людзям з абмежаванымі вялікія магчымасці для сацыяльнай адаптацыі. Невыпадкова сюды прыходзіць усё больш тых, каго напаткалі цяжкія жыццёвыя абставіны. І ім дапамагаюць набыць упэўненасць у сабе.

Калі тут з'явіцца спартыўны комплекс, пасёлак стане пляцоўкай культурнага і спартыўнага жыцця не толькі Мінскай вобласці, але і краіны. А пакуль тут закладзена і асвечана Алея беларускай параалімпійскай славы. Пачатак добрай справе пакладзены.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
lazovskaya@zviazda.by


Свае карціны Дзмітрый ШЫЦІКАЎ малюе крэйдай.


Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу (у цэнтры) перадае ў дар прыходу свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага ікону святой Валянціны Мінскай.


Айцец Дзмітрый: «Гэтую прыгажосць стварылі дзеці з абмежаванымі магчымасцямі».
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ТРАДЫЦЫІ Ў СУЧАСНЫМ ВЫКАНАННІ

**На тэрыторыі Юравіцкага і Малааўцюкоўскага сельсаветаў Калінкавіцкага раёна будуць створаны міні-кластары аграэкатурызму.**

У «круглым стале» прадстаўнікоў структур, зацікаўленых у развіцці сваіх населеных пунктаў, прыняло ўдзел кіраўніцтва раённага Савета дэпутатаў, старшыні сельвыканкамаў, гаспадары аграсядзіб, кіраўнікі ўстаноў адукацыі і культуры, актывісты мясцовых ініцыятыўных груп, расказаў **старшыня раённага Савета дэпутатаў Валерый ЦІХАНОЎСКІ.**

— Міні-кластар — гэта сканцэнтраваная на вызначанай тэрыторыі група ўзаемазвязаных аб'ектаў і ўстаноў, якая заклікае змяніць стэрэатыпы ў рабоце агратурыстычных аб'ектаў і дазволіць выпрацаваць новы механізм развіцця сельскіх тэрыторый, — тлумачыць галоўны **спецыяліст аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Святлана СЯЛЮК.** — Для таго каб людзі зразумелі, што гэта такое, мы гаворым пра «дваровую тусоўку», якая будзе садзейнічаць мясцоваму развіццю і ўрэшце павінна дапамагчы зарабляць людзям грошы, забяспечваць іх самазанятасць. Дарэчы, рашэнне гэтага пытання з'яўляецца асноўнай мэтай мясцовай ініцыятывы, якая рэалізуецца ў рамках праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь».

У склад міні-кластара «Юравічы» ўвайшлі Юравіцкі сельсавет, аграсядзіба «Лiтвін», Свята-Раства-Багародзічны мужчынскі манастыр, Юравіцкі дзіцячы сад—сярэдняя школа, Цэнтр народнай творчасці, філіял Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Удзельнікамі міні-кластара «Аўцюкі» сталі Малааўцюкоўскі сельсавет, аграсядзіба-музей народнага гумару «Аўцюкі», Малааўцюкоўская сярэдняя школа і сельскі Дом культуры.

Мяркуецца, што аб'яднанне намаганняў і рэсурсаў усіх структур і турыстычных аб'ектаў дапаможа фарміраванню самадастатковай у сваім развіцці і эканамічным стане тэрыторыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

# МОСТ ПАПЛЫВЕ... НА ТЭХАГЛЯД

**Два берагі ракі Гарынь паміж вёскамі Рубель і Беражное Столінскага раёна даўно злучае не зусім звычайны мост. Так званы наплаўны мост вырабілі на Пінскім суднабудаўніча-суднарамонтным заводзе. Вось і служыў ён верай і праўдай палешукам паўтара дзясятка гадоў. Але спецыялісты сказалі, што патрэбны тэхагляд.**

Рэспубліканскае прадпрыемства па тэхнічным наглядзе і класіфікацыі суднаў «Беларуская інспекцыя рачнога рэгістра» запатрабавала адправіць мост на абавязковы тэхнічны агляд. Такім чынам мост неўзабаве знімуць з месца і сплаўляць па вадзе ў Пінск. Пінскія карабелы правядуць агляд, прафілактыку і рамонт збудавання, каб гарантаваць бяспеку далейшай яго эксплуатацыі.

А да вясны шлях са Століна ў Рубель і ў зваротным напрамку стане нашмат даўжэйшым. Ехаць давядзецца праз Давыд-Гарадок.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** yackevich@zviazda.by

# «ПАЛЯШУК» З УСІМІ ВЫГОДАМІ

**Дом паляўнічага і рыбалова «Паляшук» адкрыўся ў вёсцы Канатоп Нараўлянскага раёна. Установа, якая знаходзіцца за пяць кіламетраў ад райцэнтра, належыць Нараўлянскаму філіялу беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.**

Адкрыццё такога аб'екта — гэта агульны ўнёсак мясцовых улад і таварыства ў забеспячэнне жыццядзейнасці населенага пункта, што дапаможа развіваць турыстычны патэнцыял поўдня краіны. Дом паляўнічага і рыбалова абсталяваны ўсімі выгодамі для камфортнага пражывання. Акцэнт зроблены на лаканічнасць і экалагічнасць, у аздабленні прысутнічае шмат натуральнага дрэва. У гэтых мясцінах сапраўды можна адарвацца ад гарадской мітусні, нацешыцца дзіўнай прыгажосцю Прыпяці, лепш даведацца пра багатую гісторыю Нараўлянскага краю. У арганізатараў праекта яшчэ шмат ідэй.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by